

# ГРОДЗЕНСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ГАЗЕТА КАЛЕКТЫВУ ГРОДЗЕНСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ Я.КУПАЛЫ

*№ 11 (228) 1 снежня 1995 года, пятніца*

## НА НЯВЕ... БУДЗЕ СНІЦЦА ГРОДНА

Гэты сонечны лістападаўскі дзень, калі асляпляльна біў у вочы першы іскрысты снег, Панфіл Васільевіч будзе памятаць! Кветкі, цёплыя словы... Іх шмат гаварылася ў адрас гэтага нястомнага, сумленнага, спагадлівага чалавека. 33 гады адпрацаваў ён у нашым універсітэце. Амаль увесь час узначальваў савет ветэранаў вайны і працы, быў нязменным членам рэктарата, вучонага савета. Больш двух дзесяцігоддзяў запар спалучаў асноўную працу на кафедры з грамадскай, выконваючы нялёгкія абавязкі старшыні прафкама.

Не пералічыць, колькім людзям ён дапамог, падтрымаў. Пытаюся ў Панфіла Васільевіча: якая падзея універсітэцкага жыцця найбольш запамяталася? І ён успамінае канец 70-х гадоў, калі адразу 100 сем'яў атрымлівалі доўгачаканыя ключы ад кватэр. Іх радасць была і яго радасцю. Тады і заўсёды.

Гэты чалавек непадуладны ўзросту. Цяжка ўявіць, гледзячы на яго бадзёрую постаць і маладжавы твар, што нарадзіўся ён яшчэ ў царскай Расіі. Упарта і шмат вучыўся. Вялікая Айчынная вайна застала лейтэнанта Васільева ў Кіраве. Удзельнічаў у абароне Масквы, у баях пад Сталінградам. Яго баявы шлях пралёг праз далёкую Калмыкію, праз Украіну, Беларусь, Літву, Польшчу, Чэхаславакію. Штурмаваў Берлін. Не штабным пісарчуком прайшоў ён гэты шлях. Спачатку артылерыстам, пасля разведчыкам, ён не адзін раз глядзеў смерці ў вочы, не адзін раз у думках развітваўся з жыццём. Быў паранены, двойчы кантужаны. Але жывы! Ордэн Баявога Чырвонага Сцяга, тры ордэны Айчыннай вайны і тры - Чырвонай Зоркі, 15 медалёў - яго гонар, яго памяць, напамінак пра тое жахлівае ліхалецце.

У 1959 годзе, у званні падпалкоўніка П.В. Васільеў мог ісці ўжо на заслужаны адпачынак, меў на гэта права. А ён... пачаў жыццё нанова. Некалькі год адпрацаваў у школе, а ў 1962 годзе прыйшоў у калектыў педінстытута. Замест адпачынку - цэлая жыццёвая вяха, клапатлівая і неспакойная. Затое колькі сяброў, колькі блізкіх людзей побач усе гэтыя гады. Многіх некалі ён вучыў, зараз у іх - свае вучні, а Панфіл Васільевіч па-ранейшаму энергічны, жыццерадасны, таварыскі і вельмі шаноўны сярод калег і сяброў. Бо сэрца ў яго добрае, душа - адкрытая і шчырая, думкі - светлыя.

Якое нечаканае супадзенне: у такую ж пару позняй восені 1945-га маёр Васільеў прыбыў з Прагі ў Гродна для праходжання тут далейшай службы, а роўна праз 50 год пакідае наш горад, наш універсітэт, ад'язджае на новае месца жыхарства, у Санкт-Пецярбург, бліжэй да дзяцей, дзе некалі, дарэчы, і сам вучыўся ў Вышэйшай афіцэрскай школе.

З нагоды развітання словы падзякі П.В. Васільеву - выдатніку вышэйшай школы і выдатніку народнай асветы, урачыста выказалі ад імя калектыву універсітэта рэктар Л.М. Півач і старшыня прафкама У.А. Хілюта. І вельмі сімвалічна, што ў напамінак пра Гродна павязе Панфіл Васільевіч у Санкт-Пецярбург сціплы прынёманскі пейзаж з выявай Калажы, як настальгічны напамінак пра лепшыя і самыя плённыя гады жыцця. Шчаслівай дарогі Панфілу Васільевічу і яшчэ шмат доўгіх, спакойных і шчаслівых год на Няве!

*С. Бераст*



*Калонка рэдактара*

## ЧАГО НЕ ХАПАЕ МАЛЕНЬКАЙ ГАЗЕЦЕ

Снежань, казалі ў народзе, зямлю грудзіць, хаты студзіць, год канчае, зіму пачынае. Мяркую, што гэты нумар газеты вы будзеце трымаць у пачатку месяца, пад дзень Кацярыны. Гэта апошні нумар года, а на самым пачатку новага мы будзем мець магчымасць зноў віншаваць сваіх чытачоў: як раз пачнуцца калядныя святы, зазіхацяць ёлкі, пачне адлік новы, 1996-ы год.

Шчыра спадзяюся: так яно і будзе, бо нам, усім тым, хто працуе над выпускамі "Гродзенскага універсітэта", заўсёды прыкра і балюча, калі абставіны мацнейшыя за нас і газета прыходзіць да сваіх чытачоў са значным спазненнем. Не таму, што ў нас не хапае творчых сіл ці натхнення. Прычына больш банальная і празаічная: недахоп грошай. Наш універсітэт, "альма-матэр" многіх учарашніх, сённяшніх і будучых выдатных вучоных, вядомых кіраўнікоў і вытворцаў, амаль цалкам трымаецца на тым, што выдзяляе дзяржава са свайго даволі сціплага бюджэту. Універсітэту для латання шматлікіх прарэхаў неабходна намнога больш сродкаў. Газета, патрэбная вялікаму калектыву, вымушана чакаць, калі ў родным універсітэце з'явяцца грошы, якія можна за яе заплаціць друкарні. Менавіта гэты адрэзак шляху газеты для нас - самы цяжкі, нярвовы, непрадказальны. Здаецца, і ёсць газета, і няма яе, і невядома, калі яна ўбачыць свет. Ужо і наступны нумар рыхтуецца, а яшчэ папярэдні не надрукаваны. Можа, наступны год будзе больш шчодрым і спрыяльным для ўсіх нас і для маленькай газеты, у прыватнасці.

У апошніх нумарах "Гродзенскага універсітэта", як заўважылі нашы чытачы, амаль адсутнічаюць фотаздымкі. Дзякуй Ул. Сарокіну, што адгукнуўся на просьбу рэдакцыі і падзяліўся здымкамі, якія змешчаны на першай і апошняй старонках папярэдняга нумара. Надзвычай бедны ілюстрацыямі і гэты выпуск. Але ж хіба перавяліся ў нас аматары фатаграфаваць? Няўжо сярод нас няма людзей, для якіх праз шкельца аб'ектыва адкрываецца цэлы свет, нябачны для іншых? Калі ласка, не пасаромейцеся і прынясіце свае набыткі да нас у рэдакцыю. Можа, такім чынам у нас наладзіцца і далейшае супрацоўніцтва. Можа, мы падтрымаем ваш талент і ініцыятыву. Ды не толькі фотааматарам мы будзем рады. Не багата ў нашай газеце студэнцкага гумару, запалу маладосці. Дзякуй навукоўцам, людзям больш сталага ўзросту, яны ахвотна дапамагаюць сваімі допісамі "Гродзенскаму універсітэту", чаго не скажаш пра студэнцкую моладзь. А шкада, бо газета з іх удзелам была б больш маладая, жывая, змястоўная. Дык чакаем!

*Святлана Мурына*

## Тэлефонны лічыльнік папярэджвае...

Будзьце нешматслоўнымі, гаварыце толькі аб галоўным, не абмяркоўвайце серыялы, стравы і моду па тэлефоне. Сёння ён робіцца ўжо вялікай раскошай, бо кожная хвіліна размовы фіксуецца лічыльнікам, накручваючы сотні, тысячы рублёў. А калі ўлічыць яшчэ і міжгародныя прыватныя перамовы, аднесеныя на рахунак універсітэта, дык лічба атрымаецца яшчэ больш унушальнай.

Напісаўшы гэтыя радкі, я зрабіла прасценькі разлік: уявіла, што кожны з супрацоўнікаў універсітэта толькі 10 хвілін у дзень, у сярэднім, размаўляе па тэлефоне, набраўшы неабходны нумар. За месяц атрымаецца багата, хоць 30 рублёў і не грошы. Дадаць абанентную плату, міжгародныя перамовы...

Як газета ўжо паведамляла, адміністрацыя універсітэта мяркуе з цягам часу ўкараніць унутраную тэлефонную сувязь, але эразумела, што справа гэта не аднаго дня. Выйсце бачна ў строгім рэжыме эканоміі і, безумоўна, у прадуманай сістэме кантролю.

*С. Іванова*



*Канферэнцыя фізікаў*

# АД НАВУКІ ДА ПРАКТЫКІ – АДЗІН КРОК

**Ва універсітэце працавала II Міжнародная канферэнцыя па лазернай фізіцы і спектраскапіі. У яе працы прынялі ўдзел вучоныя з Літвы, Эстоніі, Расіі, Беларусі.**

Лазерная фізіка і спектраскапія - гэта найбольш развітыя напрамкі сучаснай фізікі ў Беларусі. Ганаровае месца сярод навуковых цэнтраў, якія займаюцца вывучэннем гэтых праблем,займае і Гродзенскі дзяржаўны універсітэт імя Я.Купалы.

З пленарнымі дакладамі на канферэнцыі выступілі вядучыя спецыялісты ў галіне лазернай фізікі і спектраскапіі з Інстытута фізікі АН Беларусі, БДУ і ГрДУ. Ад групы фізікаў нашага універсітэта выступіў кандыдат фізіка-матэматычных навук С.А.Маскевіч з дакладам "Структурная организация тонких пленок серебра и механизмы усиления гигантского КР адсорбированных молекул".

Секцыя, на працы якой я засяродзіў сваю ўвагу , - "Фізіка лазераў". Даклады закраналі пытанні тэарэтычных асноў лазернай тэхнікі. Тэхналагічнае выкарыстанне вынікаў гэтых прац дало б магчымасць стварыць узоры новай лазернай тэхнікі, распрацаваць новыя тэхналогіі ў нас у рэспубліцы. Прыкладам такой практычнай накіраванасці можа служыць даклад А.В. Агашкова "Физика импульсных лазеров с электрооптической обратной связью". Хацелася б адзначыць працу К.Ф. Зноскі "Системы возбуждения электроразрядных эксимерных лазеров", прысвечаную даследаванню і распрацоўцы магутных лазерных крыніцаў ультрафіялетавага выпраменьвання - эксімерных лазераў. Створаныя на кафедры лазернай фізікі і спектраскапіі ГрДУ, яны выкарыстоўваюцца ў навуковых даследаваннях.

Працы, прадстаўленыя на секцыі "Прымяненне лазераў", мелі непасрэдную накіраванасць і закраналі розныя аспекты чалавечай дзейнасці. Гэта і тэхналагічнае выкарыстанне лазераў выпраменьвання для апрацоўкі зерневага корму, лазернага выпраменьвання ў медыцыне, кантроль за забруджваннем атмасферы.

Пакуль працавала канферэнцыя, у актавай зале адбылася выстава сучаснай камп'ютарнай тэхнікі.

Канферэнцыя мае рэальнае значэнне для далейшага развіцця лазернай фізікі і спектраскапіі ў нашым універсітэце. І вялікая яе каштоўнасць - гэта магчымасць падзяліцца сваімі думкамі, абмеркаваць вынікі працы.

*У. Курстак,*
*ст. выкладчык кафедры лазернай фізікі і спектраскапіі, кандыдат фізіка-матэматычных навук.*

## ПАДАРУНАК – НА АНГЛІЙСКАЙ МОВЕ

Ва універсітэце пачаў працаваць навучальна-метадычны кабінет факультэта замежных моў (аудыторыя 104). Тут знаходзіцца вялікая колькасць кніг на англійскай мове, якія мы атрымалі ў падарунак ад Міжнароднага Кніжнага Банка. Ёсць кнігі па розных спецыяльнасцях: лінгвістыка, літаратуразнаўства, гісторыя ЗША, камп'ютарная тэхніка, матэматыка, эканоміка, педагогіка, псіхалогія і іншыя. Ёсць цудоўнае выданне сусветнай энцыклапедыі, а таксама медыцынская, юрыдычная, дзіцячая энцыклапедыі. Добра прадстаўлены мастацкія творы розных жанраў. У хуткім часе плануецца паступленне літаратуры на французскай і нямецкай мовах. Кабінет запрашае выкладчыкаў і студэнтаў, якім неабходна такая літаратура для навукова-даследчай працы ці больш паспяховага авалодвання замежнай мовай, а таксама ўсіх жадаючых, хто цікавіцца літаратурай па розных спецыяльнасцях на замежных мовах.

*Т. Матвеенка,*
*загадчык кабінета.*

# З ЮБІЛЕЕМ!

**ІСАЧАНКА Галіну Уладзіміраўну,** старшага выкладчыка кафедры рускай і замежнай літаратуры.

**ЛУГАЧОВУ Таццяну Аляксееўну,** дацэнта кафедры гісторыі Беларусі.

**МАХАНЬ Алену Уладзіміраўну,** старшага выкладчыка кафедры англійскай і французскай моваў.

**МОРДАНЬ Алену Міхайлаўну,** прыбіральшчыцу вучэбнага корпуса № 3.

**ПЕТРЫКАВУ Наталлю Мікалаеўну,** дацэнта кафедры педагогікі.

**ХУТАРСКУЮ Ларысу Мікалаеўну,** дацэнта кафедры лазернай фізікі і спектраскапіі.

**ЧАРНОВУ Таццяну Адамаўну,** архіварыуса універсітэта.

# ВІНШУЕМ!

**Наталлю Дзмітрыеўну Стракаль,** старшага выкладчыка кафедры агульнай і тэарэтычнай фізікі, з паспяховай абаронай кандыдацкай дысертацыі.

*Калегі і студэнты фізіка-тэхнічнага факультэта.*





**НА ЗДЫМКУ: Н.Дз.Стракаль са студэнтамі**
**Фота А. Пятрова**

# БІБЛІЯТЭКА КНІЖАК НЕ ДРУКУЕ...



Бібліятэка універсітэта прадстаўляе сабою складаны механізм, які адначасова выконвае функцыі навуковага, навучальнага і выхаваўчага цэнтра. Вялікая яе роля ў падрыхтоўцы адукаваных, кампетэнтных спецыялістаў. Бібліятэка - адна з важнейшых лабараторый універсітэта па забеспячэнню навучальнага працэсу і навукова-даследчай працы выкладчыкаў і студэнтаў.Сумесна з кафедрамі бібліятэка ажыццяўляе камплектаванне фонду неабходнай навучальнай і навукова-метадычнай літаратурай. У цэлым забяспечанасць падручнікамі і дапаможнікамі ў нас нядрэнная. 80 працэнтаў студэнтаў атрымліваюць неабходную літаратуру. Да тых падручнікаў, якія былі ў наяўнасці, за мінулы навучальны год мы атрымалі больш як 92 назвы вучэбнай літаратуры па культуралогіі, паліталогіі, філасофіі, сацыялогіі, вылічальнай тэхніцы і інш. Напрыклад, на 8 назваў папоўніўся кніжны фонд, адрасаваны тым, хто вучыцца на факультэце замежных моваў, на 12 найменняў - для факультэта гісторыі і культуры, 7 - для факультэта матэматыкі, 8 - для фізіка-тэхнічнага, па некалькі назваў кніг атрымалі факультэты псіхалогіі і педагогікі, біялогіі і эканомікі, а найбольш літаратуры атрымаў факультэт права і эканомікі - 23 назвы.

Атрыманы, у прыватнасці, такія неабходныя падручнікі: Ф. Котляр "Основы маркетинга", М. Цэдрык "Курс агульнай фізікі", "Зборнік задач і практыкаванняў па вышэйшай матэматыцы", Л. Мурына "Рыторыка", Б. Купчыкаў "Нарысы гісторыі Беларусі", ч. 1-2, "Беларуская народная педагогіка" і іншыя.

Фонд навучальнай літаратуры папаўняецца за лік дапаможнікаў, якія падрыхтаваны да друку на нашых кафедрах. Гэтыя выданні карыстаюцца вялікім попытам сярод студэнтаў. Аднак па некаторых дысцыплінах, на жаль, літаратуры ўсё ж недастаткова. Гэта датычыць падручнікаў па батаніцы, лацінскай і грэчаскай мовах, грамадзянскім і крымінальным праве, па асновах эканамічнай тэорыі, методыцы выкладання, экалогіі. Многія з наяўных падручнікаў па зместу не адпавядаюць ужо часу і не перавыдаюцца.

Адчуваецца недастатковая забяспечанасць падручнікамі па некаторых прадметах на факультэце права і эканомікі. Прычына тая ж: існуючыя састарэлі, як кажуць, маральна, а новыя не выдадзены.

Асаблівыя вялікія нязручнасці адчуваюць студэнты і выкладчыкі новага аддзялення МЭА, бо падручнікі для іх даволі спецыфічныя, а ў нашай рэспубліцы не відаць нават перспектывы іх выдання ці перавыдання. А між тым, колькасць студэнтаў па гэтай спецыяльнасці расце, адсюль і незабяспечанасць патрэбнай літаратурай.

Камплектаванне навучальнага фонду не толькі ў нашым універсітэце сутыкнулася з аб'ектыўнымі цяжкасцямі, звязанымі з распадам былога Саюза. Цэнтралізаваная сістэма, якая дзейнічала ў краіне, даўно ўжо разбурана. Калі раней з Расіі праз аблкнігагандаль бібліятэка універсітэта атрымлівала 80 працэнтаў найменняў навучальнай літаратуры, то за апошнія 3 гады мы атрымалі толькі каля 5 працэнтаў, да таго ж у невялікай колькасці экземпляраў.

Ў гэтым годзе больш-менш наладжана кнігазабеспячэнне з Расіі праз кніжны кіёск універсітэта, кніжныя магазіны горада і прыватных гандляроў. Аднак такі шлях забеспячэння бібліятэкі кнігамі стыхійны, выпадковы. Атрымліваць літаратуру з Расіі цывілізаваным метадам вельмі цяжка перш за ўсё таму, што там яна даражэйшая ў 3-4 разы. Калі ж кнігі атрымліваць па пошце, накладной платай, то перасылка будзе каштаваць даражэй, чым сама літаратура. Не лепшы і іншы шлях набыцця кніг з Расіі: аўтатранспартам універсітэта пры ўмове наяўнага разліку за прадукцыю. Але ў такім выпадку наяўных трэба мець некалькі мільёнаў рублёў. Не сакрэт, што вялікія грошы сёння нашаму універсітэту, як і іншым вну, не па кішэні.

Гэтыя праблемы добра вядомыя Міністэрству адукацыі і навукі. Таму робіцца ўсё магчымае, каб наладзіць выпуск неабходнай літаратуры беларускімі выдавецтвамі, вышэйшымі навучальнымі ўстановамі, камерцыйнымі структурамі. Ёсць надзея, што рана ці позна пытанне забеспячэння падручнікамі, якое сёння так хвалюе студэнтаў, выкладчыкаў, работнікаў бібліятэк, будзе вырашана станоўча і перастане быць "вузкім месцам" у навучальным працэсе.

За 10 месяцаў гэтага года бібліятэка універсітэта атрымала літаратуры коштам больш як на 100 мільёнаў рублёў. Улічваючы немалы кошт кожнай асобнай кніжкі,колькасць літаратуры не такая і вялікая, аднак рэктарат, бухгалтэрыя імкнуцца выдаткоўваць сродкі на набыццё літаратуры.

Вельмі вялікая праблема для нашай бібліятэкі - захаванасць навучальнага кніжнага фонду. Балюча глядзець на кнігі з вырванымі старонкамі, цэлымі раздзеламі, яшчэ цяжэй канстатаваць кожны выпадак страты падручнікаў. А гэта з'ява сярод студэнтаў - як хранічная хвароба. На працягу навучальнага года беззваротна губляецца больш за 500 падручнікаў, а колькі іх застаецца "скалечанымі" - без старонак, з надпісамі,плямамі і г.д. Не перавялася заганная звычка выносіць кнігі з чытальнай залы без запісу. Колькі не нагадваюць нашы работнікі студэнтам, каб вярталі падручнікі адразу пасля здачы летняй сесіі, - не дапамагае. Падыходзіць новы навучальны год і зноў мы сутыкаемся з цяжкасцямі пры камплектаванні падручнікаў: іх хранічна не хапае, хоць яны павінны быць, але затрымаліся ў некага на руках.

Хачу звярнуцца да нашых выкладчыкаў і студэнтаў: няхай тое, што напісана вышэй, будзе адказам на вашы шматлікія папрокі,якія гучаць у адрас бібліятэкі на сходах, нарадах, пасяджэннях саветаў. Бібліятэка літаратуру не друкуе. Разам з кафедрамі мы заказваем літаратуру па розных бібліяграфічных крыніцах, шукаем яе, атрымліваем, класіфікуем, перадаём у аддзелы абслугоўвання. Але і вы шануйце яе, каб хапіла не толькі вам, але і тым, хто будзе вучыцца заўтра.

Наша бібліятэка заказвае ўсю літаратуру па профілю універсітэта, якая выдаецца ў межах рэспублікі. Іншая справа, што нярэдка па розных прычынах яна не выходзіць у свет.Так здарылася, напрыклад, з падручнікамі па методыцы выкладання, якіх шукалі студэнты ў мінулым навучальным годзе і ў гэтым. Вінавацілі ў іх адсутнасці бібліятэку, а што можам зрабіць мы, калі падручнікі не аддрукаваны?

Няма неабходнасці вінаваціць бібліятэку ў тым, што літаратуры хапае не на кожнага студэнта. Згодна "Палажэння аб фармаванні вучэбнага фонду бібліятэк вну", добрай забяспечанасцю лічыцца становішча, калі адзін падручнік прыходзіцца на трох студэнтаў. Лічу, што гэта абгрунтаваны разлік. Бо калі бібліятэка будзе заказваць і атрымліваць падручнікі на кожнага студэнта, то нам спатрэбяцца не сотні, а тысячы экземпляраў па прадметах. Для размяшчэння такога вялікага фонду трэба мець яшчэ большыя плошчы і яшчэ большыя грошы. Дарэчы, за мяжой усе бібліятэкі вну атрымліваюць літаратуру толькі для чытальных залаў і яна не выдаецца дамоў. Праблема забяспечанасці кнігамі кожнага там наогул не абмяркоўваецца. Нашы студэнты прывучаныя да таго, каб браць кнігі ў бібліятэцы на працяглы час і вучыцца па іх, лежачы на ложку, нават, можа, спаць з падручнікам. Адымі ад яго гэту прывілею, і студэнт скардзіцца ў дэканат, што яго не забяспечылі літаратурай. Але сёння ўжо напэўна, трэба прызвычайвацца да аб'ектыўных абставін і не чакаць большага, чым можа даць дзяржава.

І ў бібліятэцы шмат сваіх, унутраных праблемаў, якія ўскладняюць працу. Трэба шмат сродкаў, каб мець усё неабходнае, але дзе іх узяць? Аднак назаву першаступеннае. Неабходна мець камп'ютары ў бібліятэках вучэбных корпусаў №№ 1, 2, 4, каб была магчымасць увесці ў іх асноўныя паказчыкі, у тым ліку і па забяспечанасці студэнтаў падручнікамі. Вельмі неабходны "ксеракс", каб студэнт мог зрабіць копію з патрэбнай старонкі, а не вырваць яе, не псаваць кнігу. Патрэбны "ксеракс" для МБА, для размножвання разнастайных бібліяграфічных і метадычных матэрыялаў.

Пажадана, каб нашы кафедры больш рыхтавалі тых дапаможнікаў па прадметах, якія адсутнічаюць у продажы і ў бібліятэках. Пішыце, друкуйцеся, мы будзем рады папоўніць наш фонд вашымі кніжкамі і выдадзім іх студэнтам.

***В. Станкевіч,***
***дырэктар бібліятэкі***

## Новыя паступленні літаратуры

Интернет. Всемирная компьютерная сеть: Практическое пособие - М.: Синтез.

Бойс Дж. Осваиваем Windows 95 - М.: Бином,

Крупенин А.Л. Крохина И.М. Эффективный учитель: Практическая психология для педагогов - Ростов н/Д: Феникс.

Введение в культурологию: Учеб. пособие для вузов - М.: Владос,

Мезенцева Т.М. Основы бухгалтерского учета: Учебное пособие. -Минск: ООО "Аудикс",

Зеликман А.Я. Английский язык для юристов - Ростов н/Д: Феникс,

Москальская О.И. Немецкий язык - М.: Аквариум,

Елисеева И.И. Костеева Т.В. Хоменко Л.Н. Международная статистика: Учеб. пособие. / Минск, Высш. шк.,

Уся літаратура выдання 1995 года.



# Праз фальклор - да мінулага

**Студэнты 2 курса факультэта замежных моваў ужо па добрай універсітэцкай традыцыі праходзілі фальклорную практыку ў розных раёнах Гродзенскай вобласці.**
**Дзяўчаты сабралі багаты фальклорны матэрыял, напісалі цікавыя водгукі аб жыхарах вёсак, носьбітах народных традыцый. На жаль, мы не можам змясціць усе матэрыялы на старонках нашай газеты, але прапануем пазнаёміцца з некаторымі.**

## БАБА МАНЯ ИЗ БЕЛИЦЫ

На летнюю фольклорную практику я попала в Лидский район, в деревню Белица.

Нелегкими оказались поиски людей, которые смогли бы спеть старинные песни, тем более мне, чужому в деревне человеку. Летом сложно найти старушку, которая смогла бы уделить несколько часов для разговора. Ведь лето в деревне - самая жаркая пора: сенокос, огород. А старушки, будь им даже под девяносто, если могут ходить да грабли в руках держать - все работают. Из последних сил выбиваются, но не могут без дела сидеть.

Первые мои попытки не увенчались успехом. Бабульки отнекивались, говорили, что им некогда, что они ничего уже не помнят. Я уж было отчаялась, но бабушка Вера (ее соседки называют Пеньчиха, а еще "мама Чоли", как героиню известного сериала, который она смотрела по 2 раза в день) подсказала: "Иди к Маньке Перьянович, та тебе споет, она-то все помнит".

С последней надеждой пошла я искать дом загадочной бабы Мани. Не сложно было догадаться, где живет одинокая старушка. Облезлые, давным-давно не крашенные стены, покосившаяся от старости крыша... Постучав, я вошла. Конечно, я не ожидала увидеть дорогую мебель и ковры, но деревянная лавка, резные стулья, красивый круглый стол, за которым, наверно, собиралась семья с кучей детей, старинная этажерка будто перенесли меня в прошлое, во времена наших прадедушек и прабабушек. На полу лежала сухая трава, пахнущая лугом. Навстречу вышла маленькая, сухонькая старушка. Я решила действовать наверняка, учитывая мой горький опыт. Я представилась, сказала, по какому поводу к ней пришла, употребив все свое красноречие. Баба Маня начала говорить, что прошло много лет, и она ничего не помнит, что, дескать, не до песен сейчас, как бы прокормиться. Тогда я изменила тактику. Заметив на этажерке несколько портретов, я поинтересовалась, кто это на них снят? И баба Маня разговорилась. Она стала рассказывать о них, о себе, о своих родителях и о детях. Я поняла, что долго бабуся живет одна и давно уже ни с кем по душам не разговаривала. Потом она вспомнила несколько песен - "брандушачак", так она их называла. Иногда слова путались, забывались, но она старалась их вспомнить. После долгих усилий я записала несколько песен. В основном грустные, о нелегкой доле. Вот одна из них:

"Закуй, закуй, зязюленька радная".

Закуй, закуй, зязюленька радная,
Ды не кажы, што ночанька малая.
А я, млада, усю ночаньку не спала,
Да ўсё свайго мілага чакала.
А прыехаў жа мой міленькі позна,
Да раскідаў падушачкі розна:
- За што, за што, мой міленькі, на мяне злуеш?
- За што, за што подушачкі бузуеш?
Ці на мяне злуеш, на жонку маладую,
Ці на маю матулю старую?
- Не на цябе ж маладую, а на тваю маці старую.
Што аддала замуж маладую.
Не ўмееш пасцеленькі слаці,
Ды не ўмееш і з мілым размаўляці.

"Мая жызня - цэлая гісторыя, трэба ў кнігі пісаць", - не раз повторяла она мне. "Ты пішы, пішы, цяпер так не жывуць". Я записывала и удивлялась, как один человек смог вынести столько невзгод.

Родилась Мария Евдокимовна в 1912 году в российской глубинке. Но недолго она там пожила. Отец ее - Евдоким Егорович, был офицером царской армии и погиб на войне. Бабушка Маня принесла его портрет. Таким молодым и бравым остался он в ее памяти. Она долго гладила его лицо сухонькой ручкой: "Я часта з ім размаўляю, пытаюся як мне жыць", - сказала она, смахивая слезы.

Она его совсем не помнит, только две сохранившиеся фотографии рассказывают ей о нем. После смерти отца мать во второй раз вышла замуж и переехала в Беларусь к мужу. Об этих годах баба Маня говорила: "Жылі з айчымам, жызня сіроцкая. У айчыма былі свае дзеці - трэба было ратунку". Отчим был строителем, мать работала у попа. А Мария смотрела за детьми, везде они были с ней - и на работе, и на вечорках.

"Не стыдзілася я дзяцей, і ўсе паважалі - і хлопцы, і дзяўчаты". А ходить на танцы она любила. Была раньше такая забава. Девчонки наряжались цыганами: обували на одну ногу лапоть, на другую сапог и танцевали, а люди за это давали им деньги, конфеты. Способная к песням и танцам была Манька Перьянович. Очень хотелось ей научиться играть на гармошке. У деревни Несиловичи, где она жила, был цыганский табор. Мария познакомилась с Надей-цыганкой, та учила ее играть на гармошке. Но ничего не получилось. Как сама баба Маня говорила: "Хто ж. мяне будзе пачытаць, як я з цыганамі звязалася? Вось і адмовілася ад гармоніка". Сейчас, конечно, очень жалеет.

Умела Мария Евдокимовна петь песни и на польском языке, потому что, когда вышла замуж в 1936 г. и переехала в Белицу, приняла католическую веру.

Работала у попа в имении, там и познакомилась с будущим мужем. Он тоже рос без отца и поэтому на богатых невест не засматривался. Тяжело было - голод, холод. Родилось двое детей, один умер. Муж тоже долго не пожил на этом свете, умер в 1944 году. С тех пор живет баба Маня одна. Сын изредка приезжает.

Долго мы еще с ней говорили. Вспоминала баба Маня свою молодость и глаза ее светились от радости. Я было собралась уходить, но она захотела научить меня танцу "Ойра". И мы, взявшись за руки, попытались станцевать - молодая и старая. Получилось, конечно, не очень. Я не умела, а ей не позволяли больные ноги. Мы рассмеялись и стали прощаться.

*Татьяна Кравчук*

## ОТ ПОКОЛЕНИЯ — К ПОКОЛЕНИЮ

В последнее время все больше внимания стали уделять народному творчеству. Целые страницы газет посвящены частушкам, радио и телевидение предлагают передачи, в которых выступают фольклорные коллективы, даже для прогноза погоды стали использовать народные приметы. Почти в каждой деревне, в каждом городе существуют фольклорные группы, кружки народной самодеятельности для всех желающих. Так чем же привлекают людей народные произведения? На мой взгляд, причин несколько. Народное творчество своеобразно рассказывает историю самих предков, передает их чувства, фольклорное произведение пропитано житейской мудростью людей, которые дружелюбно относились друг к другу, "дружили" с природой, в отличие от нас, далеких от всего этого.

Человеку свойственно всегда, даже в самые тяжелые периоды жизни, тянуться к чему-то доброму, светлому. Может, приобщение к фольклору и есть частичка чего-то необходимого для нас.

Во время прохождения фольклорной практики я сделала важное для себя открытие. Каждый человек любого возраста, сам того не замечая, знает хотя бы одну народную песню, частушку или поговорку еще с детства, услышав ее от родителей, учителей. Попробуйте всмотреться в свою семью, узнать поближе своих родных. Скорее всего, ваша бабушка будет прекрасным знатоком народных песен. Наверняка, она споет, расскажет, как раньше любили петь в деревнях, как тепло относились люди друг к другу. Теперь, по-моему, такие отношения редки, отгого, может, и не поют.

А вспомните: ведь каждый день от родителей мы слышим пословицы и поговорки.

Поразмыслив над этим, поймешь, что от старших поколений перенимаешь народное творчество. А, может быть, ты потом передашь это и своим детям? Да, так и должно быть. И так от поколения к поколению. Остается то, что близко и дорого сердцу. А дороги фольклорные произведения нам по разным причинам: для бабушек и дедушек - это воспоминание о молодости, для кого-то народная песня - прекрасное настроение, а для кого-то фольклор является увлечением.

Во время практики я познакомилась с одним уникальным человеком, который посвятил всю свою жизнь фольклору. Продолжая традиции своих родителей, организовал фольклорную группу, собирает народные песни и выступает со своим коллективом перед людьми. Так что фольклор живет, живет благодаря передаче его от поколения к поколению. Так давайте пронесем через свою жизнь дорогое: пословицы и поговорки, сказки и песни, поделившись своим душевным богатством с друзьями и детьми.

***Наталья Карпович, студентка 2 курса факультета иностранных языков.***

• • •

*Запрагайце, хлопцы, коней,*
*Коні вараныя.*
*Ды паедзем даганяці*
*Годы маладыя.*
*Ой, дагналі мае годы*
*На ліпавым мосце.*
*- Вярніцеся, мае годы,*
*Хоць да мяне ў госці.*
*- А як жа вярнёмся мы*
*Да цябе ў госці?*
*Трэба было шанаваці*
*Нас табе з маладосці.*

***(Песня запісана ў в. П. Масты, 1995 год)***

## АЛЬМАНАХ: ВЫПУСК ДРУГІ

Падрыхтаваны да друку і ўжо хутка ўбачыць свет другі выпуск альманаха "Гарадзенскія запісы: старонкі гісторыі і культуры".

Рэдакцыйная рада сёлета ў тым жа складзе, што і летась: галоўны рэдактар Павел Сцяцко, сакратар Вячаслаў Ламака, а таксама Ігар Жук, Аляксей Пяткевіч, Генадзь Семянчук.

Матэрыялы альманаха - гэта новыя навуковыя даследаванні выкладчыкаў нашага універсітэта, супрацоўнікаў Акадэміі навук Беларусі, іншых вну рэспублікі, навукоўцаў з Польшчы, а таксама набыткі рэспубліканскай канферэнцыі, якая адбылася ў кастрычніку 1993 года па тэме "Культура Гродзеншчыны: спадчына, сучаснасць і перспектывы". Загалоўкі нарысаў альманаха гавораць за сябе: "Да гісторыі назваў населеных пунктаў Гродзеншчыны", "Прыказкі Гродзеншчыны: новыя запісы", "З рэгіянальнай лексікі зельвенскіх гаворак", "Нявывучаныя старонкі літаратурнай спадчыны Францішка Багушэвіча", "Старонкі краязнаўчага даведніка. Рэцэнзіі і хроніка".

*С. Іванова*



*Як жывеш, інтэрнат?*

# ЗА ТЫДЗЕНЬ ДА СТЫПЕНДЫІ



Можа ў дзень атрымання стыпендыі інтэрнацкае жыццё віруе больш імкліва і захапляюча, але я завітала ў студэнцкі дом па вуліцы Даватара ў сярэдзіне месяца. Няма больш трапнага параўнання, чым назваць гэты "вулей" другім домам, бо ў ім, як і належыць, пахне смажанай бульбай, чорнай кавай, добрымі цыгарэтамі...

Зазначу адразу: студэнтам-біёлагам, правазнаўцам і гісторыкам, што жывуць у інтэрнаце N 2, пашанцавала больш за іншых у тым сэнсе , што менавіта ў іх, на першым паверсе, размясціўся здраўпункт універсітэта. З зубным болем, напрыклад, праз горад ехаць няма патрэбы. Стаматалагічны кабінет забяспечаны сучасным абсталяваннем і матэрыялы для пломбаў замежныя,больш надзейныя і трывалыя. Вопытны доктар Святлана Іванаўна Рэуцкая запісвае хворых на прыём у чаргу, чакаць трэба амаль тыдзень. І няма ў гэтым нічога дзіўнага: харчуемся мы не надта разнастайна, ды і экалогія не спрыяе нашым зубам. Жадаючых лячыцца шмат .

Зазірнуўшы ў даволі прасторную чытальную залу на першым паверсе, дзе займаліся літаральна некалькі чалавек, адзначыла пра сябе, што святло тут даволі цьмянае, а вокны без фіранак ствараюць няўтульнасць. Можа таму дзяўчаты і хлопцы аддаюць перавагу сваім пакоям, дзе і рыхтуюцца да заняткаў.

Якія яны розныя, гэтыя невялікія студэнцкія пакоі на 4 ложкі. Па іх убранні можна беспамылкова даць характарыстыку і гаспадарам. Адны любоўна ўпрыгожаныя стракатымі дыванамі, чыстымі сурвэткамі, у іншых у вочы кідаецца зламаная мэбля, "параненыя" дзверы, неахайна пакіданая вопратка побач з рэшткамі ежы. І быццам выклік часу і грамадству чырвонымі плямамі дзе-нідзе палымнеюць былыя некалі ў пашане сцягі і транспаранты,ператвораныя зараз у фіранкі і дыванкі...

У адным з пакояў, сярод звыклых атрыбутаў халасцяцкага быцця, прыцягнуў увагу самаробны лозунг, напісаны вялікімі літарамі. Менавіта з гэтым дэвізам пачынаюць свой дзень хлопцы са 112-га: "Чтоб с утра не закурить - нужно мышцы прокачать". Крыху не рыфмуецца, праўда, затое дзейсна дапамагае, запэўнілі мяне субяседнікі.

Усе чацвёра хлопцаў сапраўды не кураць, а іх сябра Ігар кожны дзень пачынае з добрай фізічнай нагрузкі на свежым паветры.

У адным з пакояў, чысценькім і прыбраным, цэлая выстава дзявочай парфумерыі і касметыкі. Мне падалося, што куплена ўсё гэта не на мясцовым рынку, а напэўна, за мяжой. Дзяўчаты і не аднекваліся. Сапраўды, пацвердзілі яны, на стыпендыю пражыць цяжка, проста немагчыма, таму час ад часу адпраўляюцца ў камерцыйныя ваяж. Дарэчы, і на ўваходзе ў інтэрнат сустрэлася я з хлопцамі, якія, па ўсім бачна, адпраўляліся ў камерцыйную паездку. Вялікія клункі сведчылі аб гэтым.

Не буду спрачацца, грошы зарабляць трэба, але цывільным спосабам і... асцярожна, не пераступаючы закон. Яшчэ ў памяці выпадак, як мне, народнаму засядацелю Ленінскага нарсуда прыйшлося разглядаць крымінальную справу былога студэнта універсітэта М., якому наўрад ці прыйдзецца калі- стаць юрыстам. Ён таксама жыў недзе ў гэтым інтэрнаце. І хацеў жыць прыгожа. Браў у сяброў і знаёмых грошы - спачатку невялікія сумы, пасля большыя, а аддаваць не спяшаўся. З часам "апетыт" рос...Зараз следчыя збіваюцца з ног у пошуку пацярпеўшых і сведак, бо шматлікія "авантуры" маладога чалавека надта заблытаныя. Двойчы ўжо суд адпраўляў справу на даследаванне.

Але вернемся ў інтэрнат. Гаваркія дзяўчаты ў адным з пакойчыкаў расказвалі: "У душавой няма святла. Як можна памыцца? Дзявочая "палова" адчувае вялікія нязручнасці з-за адсутнасці гігіенічнага пакоя. Няхай такое памяшканне было б калі не на кожным паверсе, дык хоць адно на ўвесь інтэрнат. І якая праблема адразу адпала б! Дарэчы, у апошні час, асабліва на верхніх паверхах, назіраецца такая непрыемная з'ява, як перабоі з вадою. Раніцай і ўвечары студэнты набіраюць ваду ў бутэлькі і гэты запас ніколі не бывае лішнім.

Не менш важная і такая акалічнасць. Раней у інтэрнаце па Даватара быў буфет. І ў любы час можна было перакусіць. Зараз пра гэтую пару толькі добры ўспамін. Няўжо тое не вернецца?

"Бедныя" студэнты, каб не мець асаблівых клопатаў пра ўборку кухні, даплочваюць прыбіральшчыцам і ўжо не бянтэжацца, што нешта па іх недагляду "збегла" з каструлі і прыгарае. Мне шкада стала прыбіральшчыц, якім прыходзіцца выносіць столькі смецця і вымываць столькі бруду. Чужую працу цаніць мы не заўсёды ўмеем. Вось і не вытрымлівае каналізацыя, а яна ўжо не новая і рамантаваць, відаць, няма сродкаў. З перапоўненых кухонных ракавін вада сцякае на падлогу, стаяць лужыны. Пакалечаныя раскамплектаваныя краны не працуюць, з фаеркамі на плітах - тая ж гісторыя. А быў час, студэнтам выдавалі нават кухонны посуд. Не навучаныя шанаваць грамадскае ўчора, сёння адчуваем нязручнасці ўсё мацней і мацней.

Адкруціўшы нейкі дрот, заглядваем у залу. Божа... Калісьці на ўсю сцяну тут зіхацелі люстэркі, было дастаткова трэнажораў і можна было займацца спортам, не выходзячы з дома. Сёння пакой былога клуба атлетычнай гімнастыкі "Альтаір" варты жалю і спачування, толькі тое-сёе засталося ад былой раскошы.

У мяне, паважаныя чытачы, не настальгія аб мінулым часе. Гэта трывога за нашу безгаспадарчасць і непрадбачлівасць, за тое, што нашы дзеці не навучыліся быць беражлівымі і ашчаднымі, а манны з неба ніхто не кідае.

Застаецца дадаць, што суправаджаў мяне сярод вячэрняй інтэрнацкай мітусні студэнт чацвёртага курса факультэта права і эканомікі Юрый Янчук, чалавек прызвычаены ўжо да гэтага асяроддзя і звыклы да розных хібаў быцця. Ён толькі суправаджаў карэспандэнта, а маршрут выбірала я сама. І пакоі, у якія заходзілі, таксама выбірала я, кіруючыся выключна асабістай інтуіцыяй.

*С. Мурына*



# ЯКІ ЦУДОЎНЫ БЫЎ ГЭТЫ ДЗЕНЬ!

***Студэнцкае жыццё - гэта маладосць, каханне і штосьць...***



За год адзначаецца шмат святаў. Адзначаюць іх і студэнты. Але ёсць свята, якое належыць толькі ім, студэнтам. Яно так і называецца -Дзень студэнта, а адзначаецца штогод 17 лістапада.

Нельга застацца абыякавым да гэтага дня, тым больш калі ты - сённяшні студэнт. І таму ні час зменаў, ні дрэннае надвор'е не перашкодзілі студэнтам філалагічнага факультэта беларускага аддзялення адзначыць яго так, каб запомніць на ўсё жыццё.

Пачаўся гэты дзень для студэнтаў і выкладчыкаў з канферэнцыі, якая высветліла адказы на пытанні, што хвалююць студэнта. Пытанні да выкладычкаў былі разнастайныя: ад "палітычных" (куды лепш хаваць шпаргалкі) да нават "інтымных" (як вы адносіцеся да экзаменацыі на кватэры ў студэнтак).

Было вырашана хаваць шпаргалкі не вельмі нізка, але і не вельмі высока, каб зручней было дастаць. А лепш кладзіце іх у парту!

Даведаліся мы і пра першыя незалікі і "2" выкладчыкаў. І па сакрэту скажам: першая "2" у выкладчыка нямецкай мовы Патрэбы М.С. была менавіта па... нямецкай мове.

У сваіх адказах выкладчыкі паказалі сябе не толькі як сур'ёзныя навукоўцы, але і як сапраўдныя гумарысты. Прыз сімпатыі атрымала выкладчыца літаратуры Руцкая А.В., якая расказала пра сваё студэнцкае жыццё і да слёз рассмяшыла ўсіх, хто прысутнічаў у зале.

Паказалі свае здольнасці і студэнты, якія ўдзельнічаюць у фальклорным гуртку факультэта філалогіі, праспяваўшы народныя песні і прадставіўшы народныя танцы.

Няшмат студэнтаў прыйшло на вечар-віншаванне. Але тыя, хто прыйшлі, не пашкадавалі аб гэтым. Канцэрт пачаўся з выступлення выкладчыкаў, якія прадэманстравалі свае таленты і ўменні. Выглядалі яны быццам звычайныя студэнты, бо яны хоць і вучаць нас, але і вучацца разам з намі. Гэта ж былыя студэнты! Таму і вырашылі студэнты сучасныя зрабіць ім падарунак у гэты дзень: торт у выглядзе кнігі. Урачыста, пад святочную музыку яго ўручылі дэкану факультэта Тамашэвічу Т.И.

Пасля выступілі студэнты першага, другога і чацвёртага курсаў са сваёй праграмай. Канешне, да выкладчыкаў ім трэба яшчэ дарасці, аднак і яны павесялілі гледачоў.

"Чараўніца" і "Цыганка" прынялі 1-ы курс у студэнты. І пад гукі апошняй песні на сцэне ў вальсе кружыліся былы дэкан факультэта Жук І.В. і сучасны дэкан - Тамашэвіч Т.І. са студэнткамі.

Шкада было прыбіраць залу, паверхі будынку факультэта ад яркіх кветак, упрыгожванняў. А тым больш шкада было, што свята студэнта завяршалася. Чакай яго цяпер цэлы год!

*Ірына Гарошка,*
*студэнтка 4 курса*
*філалагічнага факультэта.*



**Фота Алега Пятрова**

# АНОНС

Ці многія з вас бачылі археалагічны раскоп, а ў ім - пласты, адкладзеныя стагоддзямі, перасыпаныя змярцвелым попелам войнаў, сярод якіх дзе-нідзе сустракаюцца найкаштоўнейшыя рэліквіі даўніны?

А вось нашы студэнты-гісторыкі ўжо два лета запар пералапачваюць, літаральна, перабіраюць пальцамі кожны камячок старажытнай зямлі ў раёне Новага замка.

І `летась, і сёлета кіраваў правядзеннем раскопу аспірант універсітэта Р.М. Акінчыц. Па просьбе рэдакцыі Рыгор Мікалаевіч рыхтуе допіс для чытачоў "Гродзенскага універсітэта". Плануем яго матэрыял, які будзе, напэўна, цікавым, змясціць у наступным нумары газеты.

*С. Іванова*

## Адмовілася быць... Барбарай Радзівіл

Не так даўно прачытала я невялікае паведамленне ў "Гродзенскай праўдзе": рэжысёр Віктар Дашук зняў фільм пра гісторыю кахання сярэдневечнай прыгажуні Барбары Радзівіл і польскага караля Жыгімонта Аўгуста. Галоўную мужчынскую ролю выканаў вядомы гродзенскі бард і акцёр Віктар Шалкевіч, а жаночую... студэнтка нашага універсітэта. З якім імпэтам узялася я шукаць гэту дзяўчыну: праз аддзел кадраў, прафкам, дэканаты, факультэты. Ды ўсё марна: ніхто нічога не ведаў ні пра здымкі фільма, ні пра студэнтку-артыстку. Тады праз тэатр лялек знайшла Віктара Шалкевіча. Я ўжо ўяўляла, што ўдача блізка і вось-вось даведаюся імя шчаслівіцы, што ўдала дэбютавала,убачу прыгожы твар, ясныя вочы... Ды Віктар Шалкевіч расчараваў: журналіст з "Гродзенскай праўды" нешта пераблытаў ці не дачуў. Размова сапраўды ішла аб тым, што ролю прапанавалі студэнтцы Гродзенскага універсітэта, але (назавём яе проста) Ларыса... адмовілася. Спешна шукалі ёй замену. Знайшлі. Ролю Барбары Радзівіл выканала студэнтка акцёрскага аддзялення Мастацкай акадэміі. Але чаму не наша дзяўчына з Гродна? Чаму спасавала Ларыса? Можа яна сустрэнецца з карэспандэнтам універсітэцкай газеты і раскажа... пра сябе наогул? Вельмі хацелася б з ёй пазнаёміцца! Патэлефануй нам!

*С. Бераст*

**Рэдактар С.МУРЫНА.**
**Камп'ютарная вёрстка**
**А.СЯМЁНАЎ.**

Аўтары надрукаваных матэрыялаў адказваюць за падбор і дакладнасць прыведзеных фактаў, цытатаў, эканамічных даных, асабістых імёнаў, геаграфічных назваў і іншай інфармацыі, а таксама за тое, каб у матэрыялах не ўтрымлівалася даных, якія не падлягаюць адкрытай публікацыі. Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы ў парадку абмеркавання, не падзяляючы пункту гледжання аўтара.

Наш адрас:
230023, г. Гродна, вул. Ажэшкі. 22, пакой 404. Тэл. 44-72-97

Газета выходзіць адзін раз у месяц. Аб'ём - 1 друк. арк.
Здадзена ў набор 20.11.95г.
Заказ ________
Наклад 700 асобнікаў

Газета набрана, звярстана і аддрукавана ў выдавецкім аддзеле універсітэта .
Рэгістрацыйнае пасведчанне № 421.

Заснавальнікі: Вучоны Савет універсітэта, прафкам супрацоўнікаў, прафкам студэнтаў